было следующее, а именно то, что выводил их дирижер- еврей. Кантор нашел великолепный подход, символ «от обратного». Этот образ захватывал весь зал, включая зрителя, завораживал, но в то же время наводил страх.

Марк Шагал и Тадеуш Кантор никогда не были знакомы, хотя, несомненно, знали друг о друге, они поддерживали и дополняли еврейскую культуру театральными работами в самый тяжелый период жизни европейский стран во время Второй мировой войны.

Т. Кантор скончался в возрасте 76 лет в Кракове в 1990 г., М. Шагал ушел из жизни вдали от родного города Витебска, в Сен-Поль-де-Вансе в 1985 г., не дожив до своего столетия двух лет.

### Литература


1. Апчинская Н. Театр Марка Шагала (Конец 1910—1960-годы). Витебск: Из-во УО «ВГТУ»,2004. — 22 с.
2. Березкин В. И. Искусство оформления спектакля.— М.: Знание, 1986. — 128 с.
3. Березкин В. Польский театр художника: Кантор, Шайна, Мондзик Виктор Березкин. — М.: Аграф, 2004. — 336 с.\\Цит. по кн.: T. Kantor: Rewindykacje. Przedmet 1944. Maszynonopis.
4. Березкин В. И. Советская сценография. 1917—1941. — М.: Наука, 1990. — 224 с.
5. Котович Т. В. Энциклопедия русского авангарда — Мн.: Экономпресс, 2003. — 416 с.
6. Подлипский А. М. Марк Шагал. Основные даты жизни и творчества — Витебск: Витебская областная типография, 2000—64 с.
7. Полная энциклопедия символов\сост. В. М. Рошаль. — М.: АСТ; СПб.: Сова, 2007. — 515 с.



*Трапянок У. А.*
*БДУКіМ, Мінск*


## БЕЛАРУСКІ РАДЫЁТЭАТР У XXI СТАГОДДЗІ

Гісторыя радыётэатра Беларусі налічвае ўжо амаль 8 дзясяткаў гадоў. На месцы цяперашняга сталічнага кінатэатра “Перамога” па вуліцы Інтэрнацыянальнай у 1930-я гады размяшчаўся будынак Клуба харчавікоў, які на той час быў адной з лепшых пляцовак Мінска. Менавіта там у 1934 годзе пачаў дзейнічаць радыётэатр [1, с. 10], які прапаноўваў слуха-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чам пастаноўкі і канцэрты з удзелам вядомых артыстаў. Праўда, трансляцыі спектакляў па радыё пачаліся з 1928 года, і першай "ластаўкай" стала перадача ў эфір інсцэніроўкі "Чорт і Баба" Ц. Гартнага, якая была ўключана ў праграму творчага вечара, прысвечанага беларускаму мастацтву. Пасля ладзіліся трансляцыі з клубаў і тэатраў. Для радыёслухачоў свае рэпертуарныя спектаклі гралі калектывы БДТ-1 і БДТ-2, а таксама дапамагалі рабіць інсцэніроўкі літаратурных твораў [2, с. 290]. У канцы 1930-х гадоў была ўведзена практыка абавязковага абмену запісамі з іншымі рэдакцыямі былога СССР. У фанатэку Беларускага радыё перадаваліся спектаклі з Масквы, Ленінграда, Кіева, Тбілісі, Львова [3, с. 127]. Так пачыналася гісторыя айчыннага радыётэатра.

У пачатку 1990-х гадоў абменны працэс спыніўся, адпаведна, слухачы страцілі магчымасць чуць у эфіры новыя небеларускія пастаноўкі. І хаця ў гэты час у мінскай студыі спектаклі яшчэ запісваліся, пачынаўся перыяд заняпаду радыётэатра. Найбольш востра ён адчуўся ў пачатку XXI стагоддзя, калі на Беларускім радыё пачалося тэхнічнае "пераўзбраенне". У сувязі з пераходам на лічбавае вяшчанне, старая тэхніка, у працы з якой выкарыстоўвалася стужка, замянялася новай, камп'ютарнай. На рамонт зачыніўся і легендарны "5-ы драмблок", дзе раней запісвалі спектаклі.

Адбываліся змены ў структуры Беларускага радыё і яго эфірнай палітыцы. 1 студзеня 2002 года на хвалях "Радыё-2" з'явіўся новы канал "Культура", асноўнай задачай якога была вызначана папулярызацыя нацыянальнага і замежнага мастацтва. Менавіта на гэтым канале зноў звярнуліся да традыцыйнага для Беларускага радыё так званага "літаратурнага тэатра", які выходзіў у эфір амаль з першых дзён радыёвяшчання нашай краіны. Гэта спрошчаны варыянт радыётэатра, калі перад мікрафонам твор агучвае адзін выканаўца. Так, у эфіры канала "Культура" з'явіліся папулярныя і па сённяшні дзень перадачы "Літаратурная анталогія", якая знаёміць слухачоў з найлепшымі творамі айчынных літаратараў, і "Бестселер", героі якога — найбольш папулярныя аўтары планеты. Па сутнасці, гэта выправіла сітуацыю недахопу мастацкага слова ў эфіры. Аднак такі спосаб агучвання літаратуры не можа супернічаць з паўнавартасным радыёспектаклем, паколькі па працягласці гэта ўжо радыёсерыял, па спосабе выканання ён больш падобны да спрошчанага монаспектакля без вельмі важнага выразнага сродка радыёспектакля — шумавога адлюстравання дзеяння.

З 2006 года пачалося паступовае рэаніміраванне радыётэатра. З'явіліся пастаноўкі, прысвечаныя пэўным каляндарным датам: у прыватнасці, "Ігнатаў рубеж" паводле твора В. Ткачова да 20-годдзя Чарнобыльскай катастрофы. (2006 год), "Паэт і дзяўчына" паводле П. Васючэнкі да 125-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы (2007 год).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1—2 снежня 2012 года ў эфіры Першага нацыянальнага канала да 130-годдзя народнага паэта краіны Я. Коласа адбылася прэм'ера апошняга на сённяшні дзень спектакля беларускага радыётэатра "Адгукніся, браце" паводле п'есы драматурга Г. Марчука. У творы апісваюцца маладыя гады будучага класіка, праведзеныя ў Мінскім астрозе, перыяд творчага станаўлення. Рэжысёр-пастаноўшчык — А. Вінярскі, гукарэжысёр — В. Бяляеў, рэдактар — Г. Шаблінская. У ролях занятыя артысты сталічных тэатраў: А. Кавальчук, С. Зелянкоўская, У. Рагаўцоў, А. Памазан, Г. Аўсяннікаў, М. Захарэвіч, Б. Барысёнак, А. Душачкін, У. Мішчанчук, Т. Гуляева і інш.

Традыцыі Беларускага радыётэатра, закладзеныя дзесяцігоддзі таму, сёння таксама працягваюць рэжысёры А. Пташук, Р. Патака. Для запісаў і чытання твораў у прамым эфіры запрашаюцца артысты вядучых тэатраў краіны — А. Гарцуеў, В. Манаеў, А. Сідарава, Н. Качаткова, Г. Кухальская і інш.

Запісы, што захоўваюцца ў фанатэцы Беларускага радыё з мінулага стагоддзя і паступова пераводзяцца на лічбавыя носьбіты, гучаць у эфіры двух галоўных каналаў: Першага нацыянальнага і "Культура", па выхадных. Аднак з часам некаторыя пастаноўкі ўжо даўно страцілі сваю актуальнасць, і іх трансляцыя не спрыяе прыцягненню ўвагі з боку слухачоў. Дзіцячая аўдыторыя, для якой раней досыць актыўна запісвалі спектаклі, у наш час увогуле абдзелена ўвагай. Драматургічны матэрыял для маленькіх зараз не запісваецца. На канале "Культура" па пятніцах у эфір выходзіць рубрыка "Дзіцячы радыётэатр" з трансляцыяй фондавых матэрыялаў. Аднак і іх змест таксама часам не падыходзіць для ўспрымання сучаснымі дзецьмі. У вячэрнім эфіры Першага нацыянальнага радыёканала гучаць малыя літаратурныя формы — казкі-калыханкі айчынных аўтараў у выкананні артыстаў мінскіх тэатраў і Беларускага радыё. Падобны праект з творамі яшчэ і замежных аўтараў — "Хвілінкі без хмурынкі" — выходзіў у вячэрнім эфіры з верасня па снежань 2012 года ў эфіры канала "Культура".

Радыёспектакль зацікавіць слухача ў тым выпадку, калі тэма, што ўздымаецца ў творы, будзе сугучна з рэальным жыццём. Своеасаблівым эксперыментам актуалізацыі драмы ў сучасным радыёэфіры можна назваць тэатральны праект "Без мантажу", які з'явіўся ў раскладзе канала "Культура" ў верасні 2012 года. Для яго ажыццяўлення аўтарам У. Трапянком быў праведзены набор у трупу, якая склалася з артыстаў-аматараў і ўдзельнікаў студэнцкіх тэатральных калектываў сталіцы. Праект ставіў на мэце агучваць класічную, сучасную драматургію і літаратуру зразумелымі і звыклымі цяперашняму пакаленню слухачоў мовай і інтанацыямі з адпаведнай хуткасцю мыслення і ўспрыняцця. Матэрыял для эфіру адаптаваўся, некаторыя творы раскладваліся па ролях, як гэта было з раманам Э.-Э. Шміта "Оскар і Ружовая Дама", а таксама дзяліліся на серыі. Затым, пераважна ў прамым



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эфіры, матэрыял агучваўся. Так, на хвалях канала "Культура" прагучалі выбраныя п'есы А. Дударава, Ш.-Л. Цілі, М. Рудкоўскага. У прамым эфіры гукарэжысёр накладаў шумавыя эфекты і музыку. Падчас правядзення І Мінскай трыенале сучаснага мастацтва праект "Без мантажу" выйшаў за межы эфірнай студыі і вяшчаў у імправізаваным студыйным павільёне з выставачнай залы трыенале. Наведвальнікі экспазіцыі маглі паназіраць за творчым працэсам і ўбачыць, як нараджаецца радыёспектакль. Паколькі ў пераноснай студыі не было тэхнічнай магчымасці стварыць неабходную атмасферу з дапамогай музычна-шумавога аздаблення, на першы план выйшла роля Вядучага спектакля, які ўводзіў слухача ў пэўныя абставіны і задаваў адпаведны настрой у пачатку п'есы.

Праект "Без мантажу" быў прыхільна прыняты слухацкай аўдыторыяй, пра што сведчаць лісты, дасланыя ў рэдакцыю, і пакінутыя запісы ў кнізе водгукаў канала "Культура" на трыенале. Аднак праіснаваў праект нядоўга: да канца 2012 года.

Што да традыцыйнага радыётэатра, актуальнай праблемай застаецца, перш за ўсё, адсутнасць адпаведнага матэрыялу з яскравымі характарамі і захапляльным сюжэтам. На Беларускім радыё не наладжаны творчыя стасункі з драматургамі, якія б напісалі п'есы для іх далейшай пастаноўкі ў студыі. Не хапае кадраў, якія б маглі адаптаваць ужо гатовую літаратуру, напісаную айчыннымі ці замежнымі аўтарамі. Яшчэ адзін вялізны прагал — адсутнасць фінансавання для ўвасаблення творчых праектаў. Між тым радыётэатр не страціць сваёй цікавасці сярод слухачоў, паколькі эфір, незалежна ад зместу, разлічаны на актывізацыю мыслення асобы: кожны, хто слухае, а не сочыць за прапанаванай карцінкай на сцэне ці экране, здольны стварыць у фантазіі ўласныя вобразы, што некалі пацвердзіла выразам "слухаючы — бачыць" рэжысёр савецкага радыё Роза Ёфе. Гэтым, дарэчы, тлумачыцца аспоўны сакрэт прыцягальнасці радыё.

**Літаратура**


1. Курков, И. Н. Белтелерадиокомпания. Мир живого эфира/И. Н. Курков. — Минск: Медиафакт, 2007. — 304 с.
2. Тэатральная Беларусь: у 2 т./рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2003. — 2 т.
3. Трапянок, У. А. Тэатр у эфірнай прасторы Беларусі: гісторыя, сучаснасць, перспектывы/У. А. Трапянок//V Няфёдаўскія чытанні "Беларускае мастацтва: гісторыя і сучаснасць": Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-творчай канферэнцыі, 29 сакавіка 2012 г. /БДАМ; рэдкал.: С. П. Вінакурава [і інш.] — Мінск, 2012. — С. 126—129.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ